Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛЮТАГА 2024 г. АЎТОРАК № 35 (30169)



ЯК ДАРОГІ ЗІМУ ПЕРАЖЫЛІ? 7

ДУША СТАРАЖЫТНАЙ СЯДЗІБЫ 13



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена МАРГУНОВА, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«У многіх галінах прадукцыя беларускіх вытворцаў апрыёры якасная. Мы выкарыстоўваем апошнія дасягненні, стандартызаваныя методыкі, стандарты — гэта ўсё выдзяляе нашу прадукцыю. Але якасць — не толькі якасць прадукту і тавару. Аб'яўлены Год якасці прадугледжвае яе ў розных кірунках — у адукацыі, дарогах, медыцынскіх паслугах, энергаэфектыўнасці, энергазберажэнні, гэта значыць, усе тыя сферы, якія нас акружаюць. Год якасці ідзе пад дэвізам «Якасць ва ўсім». Гэта залог канкурэнтаздольнасці і эканамічнага развіцця Беларусі».*

# МАЛЮЙ, ГАЛАСУЙ, ВЫБІРАЙ






У гандлёвым цэнтры «Сталіца» прайшоў інфармацыйна-асветніцкі марафон «Выбірай.BY». Яго ўдзельнікі мелі магчымасць вызначыць пераможцу ў намінацыі «Прыз сімпатый гледачоў» Адкрытага рэспубліканскага конкурсу малюнка «Выбары вачыма дзяцей». Усяго за перыяд правядзення конкурсу паступіла 2070 малюнкаў. У фінал выйшлі 30 найлепшых работ, якія раскрываюць тэму выбараў. Галасаванне, у якім прынялі ўдзел амаль 500 чалавек, праходзіла як падчас выбараў: запоўненыя бюлетэні апускаліся ў празрыстую урну.

А ўдзельнікі Маладзёжнага савета пры Цэнтрвыбаркаме Беларусі маглі паспрабаваць сябе ў ролі членаў выбарчай камісіі. Студэнткі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Ганна КАЛАМЫЦКАЯ, Ангеліна СЛЮСАР, Арыяна БУЛАЙ, Анастасія БІНЕЦКАЯ, Аляксандра ГАЛІМСКАЯ, Злата ГРЫШЧАНКА (*на фота*) выдавалі бюлетэні для галасавання, інфармацыйныя брашуры для будучых выбаршчыкаў, даводзілі да ўдзельнікаў мерапрыемства парадак галасавання.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- ВУП Беларусі ў студзені вырас на 2,8 працэнта.
- **Прыняты меры для развіцця дыстанцыйных фінансавых паслуг у Беларусі.**
- Акцыя «Маміны пірагі», прымеркаваная да Дня абаронцаў Айчыны, стартавала ў Беларусі. Ініцыятарам правядзення мерапрыемства выступіла грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын».
- **Фігурнае кіраванне і агнявы рубеж: у Горках пройдуць спаборніцтвы па трактарным біятлоне.**
- Беларусь і Зімбабвэ падпісалі мемарандум аб вытворчасці беларускіх аўтобусаў.
- **Мінскі метрапалітэн плануе летам пачаць абкатку новых цягнікоў на трэцяй лініі.**

Дэпутацкі мандат

## НАГОДА АЗІРНУЦЦА НА ЗРОБЛЕНАЕ

**Сёння, 20 лютага, стартуе датэрміноване галасаванне на выбарах дэпутатаў усіх узроўняў. Грамадзяне, якія па тых або іншых прычынах не змогуць прыйсці на ўчастак для галасавання 25 лютага — у адзіны дзень галасавання, — ужо могуць аддаць свае галасы за кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Нагадаем, што адзіны дзень галасавання пройдзе ў нашай краіне ўпершыню, а электаральная кампанія 2024 года стане самай буйной за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі. 4 красавіка вызначыцца склад Савета Рэспублікі, да 18 красавіка будуць аб'яўлены вынікі выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Такім чынам, на працягу двух месяцаў будуць сфарміраваны органы прадстаўнічай улады на найбліжэйшыя пяць гадоў.**

**Мы распыталі дэпутатаў, якія складаюць свае паўнамоцтвы, аб тым, што ім удалося зрабіць для сваіх выбаршчыкаў.**

СТАР. 4–5

На слыху

## 50 АДЦЕННЯЎ ЖОЎТАГА

Падхапіць гепатыт А нескладана. Як засцерагчыся?

**У цяперашні час у Беларусі адзначаецца актывізацыя віруснага гепатыту А (ВГА) — як і большую частку кішэчных інфекцый, яго называюць хваробай нямытых рук. Як інфармуе Міністэрства аховы здароўя, найбольшая колькасць захворванняў традыцыйна прыпадае на асенне-зімовы перыяд. Большасць хворых — гэта дарослыя ва ўзросце 18—39 гадоў, удзельная вага дзяцей не перавышае 20 % выпадкаў. У лютым—сакавіку з мэтай абмежавання распаўсюджвання захворвання ў Мінску і рэгіёнах праводзіцца вакцынацыя кантактных асоб (дарослых) — людзей, якія блізка кантактавалі з хворым пацыентам.**

**Заразіцца гепатытам А можна кантактна-бытавым шляхам — пры невыкананні правілаў асабістай гігіены праз брудныя рукі і прадметы ўжытку, пасля ўжывання вады негарантаванай якасці (калонкі, студні, крыніцы і інш.), асабліва ў перыяд адлігі ці паводкі, а таксама харчовым шляхам пры ўжыванні інфікаваных прадуктаў харчавання і прыгатаваных з іх страў. Нярэдка такая паталогія заканчваецца самастойна і без якога-небудзь актыўнага лячэння. Але ўсё ж ігнараваць гепатыт А не варта, бо таксічнае ўздзеянне на печань можа мець вельмі негатыўныя наступствы.**

**Чым небяспечны гепатыт А і як сябе праяўляе інфекцыя, а таксама аб правілах прафілактыкі мы паразмаўлялі з урачом-эпідэміёлагам Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алінай ЕМАШОВАЙ.**

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X